# Не пакладаючы рук будаваць і ўзмацняць соцыялістычную гаспадарку

## Даклад тав. ГЭЯ на конфэрэнцыі ўдарных брыгад Фрунзэўскага раёну

Таварышы! дазвольце вас прывітаць ад імя ЦК КП(б) Беларусі.

Ударныя брыгады аб'яднаюць перадавых найбольш актыўных рабочых, якія імкнуцца дапамагчы нашай гаспадарцы. Мы праводзім сёньнешнюю конфэрэнцыю для таго, каб разам абмеркаваць важнейшыя задачы, якія стаяць перад нашай партыяй і перад савецкімі і гаспадарчымі органамі. Але мы ня можам гаварыць аб нашай гаспадарцы, не аглядаючыся, асабліва тут у Менску—на мяжы з фашысцкай Польшчай, на тое, што робіцца за межамі Савецкага Саюзу. Мы павінны проста сказаць, што падзеі апошніх тыдняў (выгнаньне прадстаўніцтва з Мэксыкі, цкаваньне з прычыны „таямнічага“ зьнікненьня белага гэнэрала Куцепава, налёт на гандлёвае прадстаўніцтва ў Мюнхескаецца нашай беларускай прамысловасьцю, але для нас гэта недастаткова, таму што нашы пляны патрабуюць большага.

Па шэрагу галін прамысловасьці плян застаўся нявыкананы: мэталяапрацоўчая прамысловасьць выканала ўсяго 87 проц., гарбарная—85 проц., папяровая—94 пр. Такім чынам у першым квартале мы маем вялікі рост прамысловасьці, але недастатковы, не забясьпечваючы выкананьня пляну. Справа ня тольві ў кольвасных, а так званых якасных паказчыках. **Якасныя паказчыкі працы прамысловасьці на першы квартал і ў першую чаргу зьніжэньне сабекошту асабліва кепскія.** Вы, бязумоўна, ведаеце, якое вялізарнае значэньне мае зьніжэньне сабекошту. Зьніжэньне сабекошту адчыняе шлях да зьніжэньня толькі тады, калі прамысловасьць выканае заданьне па зьніжэньню сабекошту.

У першым месяцы другога кварталу прыметнага паляпшэньня не наступіла—усё гэта разам дае трывожныя прыметы.

### Ударыць па безгаспадарчасьці

Чаму ня выконваюцца плянавыя заданьні? Плян складаецца такім чынам, што ён можа быць выкананы. Прычына невыкананьня пляну заключаецца ў кепскай, няправільнай, а часам і проста шкодніцкай рабоце на нашых фабрыках і заводах. Можна прывесьці шэраг прыкладаў безгаспадарнасьці, злачыннанеахайных адносін, разгільдзяйства, галавацяпства, пакражы і траты каштоўных матар'ялаў. Вось гэтаму і злачынцаў, пазбаўляючыся прычын, якія тармозяць выкананьне плянавых заданьняў, даючы прыклад чоткай бальшавіцкай работы усёй масе рабочых — зьяўляюцца магутнай зброяй у справе ўздыму народнай гаспадаркі. Разьвіцьцё соцыялістычнага спаборніцтва арганізуе ўздым рабочых, утварае стымул да ўзмацненьня работы і зьяўляецца адным з асноўных мэтадаў работы па-новаму. Але гаворачы аб ударніцтве, трэба паставіць пытаньне аб тым, каб гэта ўдарніцтва было сапраўдным. Трэба праверыць, як працуюць ударныя заводы і цэхі, ці абслугоўваюць яны назвы ўдарных. Ударніцтва — ня шыльда і тым заводам і цэхам, якія назвалі сябе ўдарнымі, але ня могуць служыць прыкладам узорнай работы, трэба сказаць, што яны тва, як клясы—усе гэтыя агромністыя задачы патрабуюць вялікай колькасьці кіраўнікоў, якіх мы можам паслаць у вёску толькі з нашых фабрык і заводаў. Вынік пасылкі рабочых брыгад у вёску сказаўся ўжо ў тым, што мы маем пералом у справе абагуленьня насеньня. Апошняя 10-днёўка дала 65 проц. выкананьня. У сучасны момант мы маем прыблізна 80-85 пр. Гарадзкі рабочы павінен дапамагчы вёсцы ў справе арганізацыі вытворчасьці ў колгасах. Буйная сельская гаспадарка з ужываньнем машын з падзяленьнем працы напамінаюць фабрыку і толькі рабочы можа даць неабходныя арганізацыйныя навыкі. У колгасах ніхто ня ведае, як будуць устаноўлены разьлікі між праўленьнем і членамі колгасаў. Тут, пры ўстанаўленьні зьдзельнай

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы